УДК 398

*І.А. Швед*

# ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ АСНОВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ КОЛЕРАВЫХ СІМВАЛАЎ МІФАПАЭТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ БЕЛАРУСАЎ

Артыкул прысвечаны вызначэнню тэарэтыка-метадалагічных асноў сістэмнага вывучэння колеравых сімвалаў міфапаэтычнага мыслення беларусаў. Глыбокае сістэмнае даследаванне колеравых сімвалаў магчыма толькі ў межах адпаведнага кода; пры гэтым яго гісторыка-генетычнае вывучэнне павінна дапаўняцца функцыянальна-семантычным. Сістэмны аналіз кода прадугледжвае разгляд шырокай сінтагматычнай спалучальнасці колеравых сімвалаў і выяўленне іх парадыгматычных сувязяў. Даследаванне павінна праводзіцца на матэрыяле сістэмы традыцыйных жанраў фальклору і формаў беларускай культуры з выхадам на славянскі культурны субстрат, з улікам дасягненняў розных дысцылін.

## Уводзіны

Колеравыя сімвалы, утвараючы адмысловы культурны код, выступаюць у якасці праграм тэкстаў і сюжэтаў (пераважна міфалагічных у сваёй аснове), выконваюць ролю «семіятычнага кандэнсатара» (Ю. Лотман). Яны, як і іншыя архаічныя сімвалы, назапашваюць, арганізуюць, генерыруюць, транслiруюць (дакладней – узнаўляюць) калектыўны вопыт у дыяхранічным і сінхранічным асяродку традыцыйнай культуры [1]. Важнай з метадалагічнага пункту погляду з’яўляецца перспектыўная тэндэнцыя гуманітарных навук трактаваць вербальны сімвал, паэтычны вобраз, код ва ўзаемасувязі з працэсамі чалавечага мыслення, пазнання, працы свядомасці, з канцэптуальнымі сістэмамі, светапогляднымі канстантамі. Пры вызначэнні генезісу колеравага кода міфапаэтычнага мыслення беларусаў зыходнымі з’яўляюцца палажэнні, выказаныя такімі рознымі ў сваіх даследчыцкіх і практычных установках вучонымі, як Р. Прайс, В. Вунт, Ф. Буслаеў, А. Патабня, А. Весялоўскі, В. Фрэйдэнберг, якія ў этнаграфіі, этналогіі, фалькларыстыцы, лінгвістыцы прыйшлі да агульных высноў пра сутыкненне паэзіі ў яе «перадгісторыі» з пачаткамі мовы і міфа, дзе слова мае сакральны статус, анталагічную важкасць і выступае не сімвалам прадмета, а яго рэальнай часткай [2, с. 181–182]. Яно з’яўляецца мастацкім вобразам, выкліканым жывым пачуццём, якое «прырода і жыццё ў чалавеку ўзбудзілі» [3, с. 20].

У распрацоўцы пытанняў семантыкі і функцыянавання элементаў колеравага кода істотнае значэнне мае тэорыя кодаў, распрацаваная К. Леві-Стросам. Вучоны звярнуў увагу на такія важныя заканамернасці міфапаэтычнага мыслення, як дэдуцыраванне (эмпірычная і «трансцэндэнтальная дэдукцыя», якая ўзнікае праз пасрэдніцтва міфалагічнага поля), а таксама выкарыстанне аналогій, і ўказаў на лішак абазначальнікаў у адносінах да таго, што абазначаецца. Апошняе прыводзіць да размеркавання міфалагічных уяўленняў па разнастайных узроўнях і кодах, якія ўтвараюць своеасаблівую «рашотку» [4, с. 13, 17]. Прычым коды ў разуменні Леві-Строса – сістэмы функцый, якімі кожны міф надзяляе свае інварыянтныя ўласцівасці, – адрозніваюцца між сабой субстанцыяй плана зместу (касмалагічны код, харчовы, аграрны і інш.). Прыкметы, паводле якіх дыферэнцыруюцца коды, як адзначае А. Байбурын, «адносяцца да сферы рэальнасці, што «адлюстроўваецца», апісваецца ці выкарыстоўваецца тэкстамі» [5, с. 242] (адрозніваца коды могуць, акрамя субстанцыі плана зместу, субстанцыяй плана выяўлення, формай плана выяўлення, формай плана зместу [5]).

У дачыненні да абраду [5] і фальклору *паводле субстанцыі плана зместу* вылучаюцца такія коды, як колеравы, лікавы, прыродна-ландшафтны, дэндралагічны, саматычны, метэаралагічны, зааморфны, антрапаморфны, прадметна-рэчавы, касмалагічна-астранамічны і пад. Яны абумоўліваюць пераемнасць, цэласнасць фальклору, культурнай традыцыі ўвогуле, вызначаюць нацыянальныя і арэальныя межы культуры, спецыфіку яе светапогляднай мадэлі, забяспечваюць у ёй наяўнасць агульнай «мовы» (у яе семіятычным асэнсаванні), устойлівых каналаў зносін, а таксама магчымасць разумення і пазнання чалавекам свету, іншых людзей і сябе. І гэтым уздзейнічаюць на стан сучаснай цывілізацыі. Як слушна адзначае І. Чарота, «канчаткова і надзейна акрэсліць спецыфічныя беларускія ідэйна-вобразныя ўстоі можна будзе толькі з часам, у выніку сур'ёзных рознабаковых даследаванняў. Але подступы да іх – бясспрэчна існуючых – неабходна шукаць ужо зараз» [6, с. 104].

Даследаванне колеравай сімволікі традыцыйнай духоўнай культуры павінна абапірацца на тэорыю сімвала, распрацаваную Ю. Лотманам, які слушна ўказваў, што сімвал ніколі не належыць якому-небудзь аднаму сінхроннаму зрэзу культуры – ён заўсёды пранізвае гэты зрэз па вертыкалі, прыходзячы з мінулага і адыходзячы ў будучае; памяць сімвала заўсёды старажытнейшая за памяць яго несімвалічнага тэкставага акружэння. Адным з вызначальных пры даследаванні семантычных сувязей колеравых сімвалаў, прадстаўленых у абрадавых комплексах і вуснай паэтычнай творчасці, з'яўляецца палажэнне, выказанае Ю. Лотманам адносна функцыянавання колеравых і геаметрычных (кола, крыж, паралельныя лініі, трохкутнік) сімвалаў у вуснай культуры. Вучоны справядліва настойваў на істотным адрозненні гэтых знакаў ад іерогліфаў ці літар, бо апошнія маюць вызначаную семантыку і набываюць сэнс толькі ў сінтагматычным радзе, утвараючы ланцугі знакаў. Першыя ж маюць значэнне размытае, часта ўнутрана супярэчлівае, набываюць сэнс у адносінах да рытуалу і вусных тэкстаў, мнеманічнымі знакамі якіх з'яўляюцца. Адметная іх прырода раскрываецца пры супастаўленні фразы (ланцуга моўных сімвалаў) і арнаменту (ланцуга магіка-мнеманічных і рытуальных сімвалаў) [1, с. 351–352].

Гэтыя асаблівасці функцыянавання сімвалаў у традыцыйнай духоўнай культуры вымагаюць пры іх даследаванні рэалізацыі парадыгматычнага падыходу, у аснове якога знаходзіцца трактоўка культуры як іерархічна арганізаванай сістэмы кодаў, г.зн. другасных складаных семіятычных сістэм, якія выкарыстоўваюць розныя фармальныя і матэрыяльныя сродкі для перадачы пэўнага зместу. Гэты змест зводзіцца ў цэлым да міфапаэтычнай карціны свету. Акружэнне чалавека (у першую чаргу прадметна-атрыбутыўнае, якое дадзена чалавеку ў большыні выпадкаў у колеравым успрыманні і якое выступае як «апрадмечаны светапогляд») з'яўляецца складанай знакавай сістэмай. Яе колеравыя элементы і ўтвараюць адзін з самых архаічных кодаў – колеравы код.

Традыцыя ўпарадкавання аб'ектаў навакольнага свету паводле іх колераў, як сведчаць шматлікія даследаванні [7; 8], узыходзіць да глыбока архаічнага мыслення. Разам з паняційнымі абгуртаваннямі класіфікацыі і катэгарызацыі, мелі месца і слабыя ўзаемадзеянні плана выражэння і плана зместу. Мысленне архаічнага чалавека, якое патрабавала ўпарадкавання і асэнсавання свету, але якое яшчэ не было ўзброена паняційнымі формамі, усталёўвала і замацоўвала гэтыя слабыя сувязі ў колерава-семантычных класіфікацыях. Іншымі словамі, колеравыя ўніверсаліі аб'ядноўваюць аб'екты, якія маюць для суб'екта падобны эмацыйны тон, і дапамагаюць упарадкаваць іх, пабудаваць простыя абагульненні і вылучыць пэўныя заканамернасці, што дазваляе арыентавацца ў свеце. У колеры ў «знятым» выглядзе выяўляюцца адносіны чалавека да з'яў навакольнай і ўласнай прыроды. У колеравых канцэптах заключаны каштоўнасныя архетыпавыя (глыбінна значныя, звязаныя з выжываннем віду

і працягам роду) характарыстыкі чалавека, прыроды і грамадства. У сувязі з гэтым адзначаецца, што семантыка колеравых універсалій фіксавалася сусветнай культурай для адэкватнай адаптацыі і ўзнаўлення чалавека на ўзроўні генетычна і сацыяльна абумоўленай мэтазгоднасці [8, с. 21–22]. Папярэдні разгляд месца і ролі колеру ў культуры дазваляе заключыць, што колер выступае ў якасці змястоўнага першаэлемента культуры, пры дапамозе якога характарызуюцца людзі, жывёлы, расліны, міфалагічныя істоты, сістэматызуюцца прадметы, а таксама сацыяльныя ўстанаўленні і маральна-этычныя паняцці. Найбольш поўна семантыка і сімволіка архаічных колеравых сімвалаў адлюстравана ў фальклоры.

Вывучэнне паасобных колеравых сімвалаў па-за рамкамі кода, у межах якога яны функцыянуюць, і часта па-за кантэкстам традыцыйнай культуры не дазваляла ўсебакова раскрыць сутнасць сімвалаў міфапаэтычнага мыслення. Усведамленне таго, што ў аснове функцыянавання розных складнікаў традыцыйнай культуры знаходзіцца агульная змястоўная база, якая можа быць зведзена да комплексу даволі ўстойлівых уяўленняў пра светабудову і месца чалавека ў ёй, непасрэдна звязана з перспектыўнай тэндэнцыяй да збліжэння асобных народазнаўчых і іншых навук. Бясспрэчна, на цяперашні момант патрэбна інтэграцыя набыткаў развіцця розных навук, у прыватнасці фалькларыстыкі, кагнітыўнай антрапалогіі, культуралогіі, філасофіі, этналінгвістыкі, этнапсіхалогіі, палеаэтналогіі, мастацтвазнаўства і інш. Таму мы павінны не пагадзіцца з ідэяй, выказанай У. Анікіным адносна вывучэння з'яў фальклору. Яно, на думку вядомага рускага фалькларыста, не прадугледжвае «выхад за межы філалогіі і ўваходжанне ў вобласць такіх сумежных з фалькларыстыкай навук, як этнаграфія, народазнаўства…» [9, с. 5]. Культуралагічны катэгарыяльны апарат, велізарны фактычны матэрыял, навуковыя ідэі, выпрацаваныя прадстаўнікамі названых і блізкіх да іх дысцыплін, даюць магчымасць распрацоўкі новых, сінтэзуючых ідэй і метадаў, падказваюць крытэрыі інтэрпрэтацыі розных з'яў культуры, дапамагаюць адэкватна вызначыць тыя змястоўныя, структурныя, псіхалагічныя элементы сімвалатварэння і функцыянавання сімвалаў і кодаў, якія дагэтуль асобна не вылучаліся або не разглядаліся ўвогуле. Толькі акрэсленая інтэграцыя дае магчымасць асэнсаваць фальклорныя творы як сінкрэтычныя ўтварэнні, пераадолець непаслядоўнасць ужывання адпаведнай тэрміналогіі, а таксама ўсебакова даследаваць навуковыя праблемы, звязаныя са старажытным светапоглядам, семіятызацыяй рэчаіснасці, функцыянаваннем фальклорных кодаў, у прыватнасці колеравага кода, праз пасрэдніцтва якога мадэліруюцца складнікі традыцыйнай міфапаэтычнай карціны свету. Вынікам уліку сістэмнай прыроды фальклорных з'яў выступае ўсведамленне неабходнасці інтэгратыўнага бачання, цэласнага аналізу такога феномена фальклору і традыцыйнай культуры, як колеравы код.

Перанос акцэнтаў з эмпірыка-канстатуючага апісання фальклорнай вобразнасці, разгляду асобных сімвалаў беларускага фальклору ў рамках літаратурнай эстэтыкі на комплекснае даследаванне традыцыйнай карціны свету і сродкаў яе знакавай фіксацыі, у тым ліку колеравых сімвалаў, актуалізуе эўрыстычную каштоўнасць сістэмнага падыходу. У дачыненні да вывучэння колеравага кода такі падыход разумеецца як ідэнтыфікацыя неабходнага і дастатковага комплексу характарыстык (якія ў сукупнасці вызначаюць існаванне колеравага кода як цэласнага феномена) і рэканструкцыя працэсу і вынікаў семантызацыі колераў. Даследаванне генезісу і функцыянавання колеравага кода павінна грунтавацца на ўяўленні пра інтэгральнасць, самадастатковасць традыцыйнай культуры, сістэмную прыроду фальклорных з'яў, важную ролю не толькі (ці не столькі) утылітарных, але і сімвалічных каштоўнасцей (свет традыцыйнага фальклору – гэта свет сімвалаў, якія з'яўляюцца і стылістычнымі, і светапогляднымі катэгорыямі), выкарыстанне традыцыяй у семіятычных мэтах «мовы

рэальнасці», адзінства і агульнасць міфапаэтычнай семантыкі, дыяхранічнае «разгортванне» сімвала ў фальклорную форму, сэнс якой заўсёды адстае ад яе актуальнай рэалізацыі.

Сістэмны падыход вызначае неабходнасць даследавання колеравага кода міфапаэтычнага мыслення беларусаў у адпаведнасці з наступнымі прынцыпамі: вывучэнне не ізаляваных сімвалаў, а іх сукупнасці (акрэсленай сістэмы адносін), якая і ўтварае код, прычым цэласнасць тут – вызначальная ўласцівасць; сінтэз тэарэтычных (гісторыка-генетычных і функцыянальна-семантычных) уяўленняў пра колеравы код; вылучэнне фактараў, якія надаюць колераваму коду ўстойлівасць; акцэнт на сэнсе ўзаемасувязі складнікаў-сімвалаў. Паколькі колеравыя сімвалы – «вынік супрацоўніцтва» мастацкіх і немастацкіх утварэнняў у праекцыі істотных, стэрэатыпных уяўленняў пра колеры, навуковае апісанне гэтых сімвалаў прадугледжвае вызначэнне іх кагнітыўнага зместу, зварот да адметных канцэпцый карціны свету і мадэлі свету.

*Карціна свету* – гэта «ўніверсальныя» калектыўна набытыя вопыт-веды, вынік першаснай апрацоўкі інфармацыі ў сістэме «чалавек – свет», дынамічная канцэнтраваная сістэма панарамнага апісання (а не аналізу) свету з «уключаным» суб'ектам. У вышэйшай ступені касмалагічная і разам з тым антрапамарфічная і антрапацэнтрычная карціна свету характарызуецца рознай ступенню ўсвядомленасці яе фрагментаў, рознай ступенню іх адэкватнасці быццю і знаходзіць сваё сэнсавае канструяванне згодна з пэўнай логікай светаразумення ў мадэлі свету.

*Мадэль свету* – усеагульная шматузроўневая сістэма стэрэатыпаў, сімвалаў, кодаў, якія прадстаўляюць розныя фрагменты карціны свету (аб'екты, з'явы, падзеі і ўласцівыя ім прасторава-часавыя і якасна-колькасныя вымярэнні); рэпрэзентацыя (прасторава-часавая, якасная, колькасная, прычынная, этычная, персанажная), прынцып, структура карціны свету, усеагульная арганізацыя яе «карціннасці» (у якой элементы не зафіксаваны, а сувязі слаба вызначаны). Мадэль свету, з аднаго боку, сама стала вынікам асэнсавання свету чалавекам, а з другога, у аспекце анталагічных прынцыпаў, абстракцый, – з'явілася падмуркам фарміравання сімвалаў і кодаў фальклору, выступіла ўмовай інтэрпрэтацыі свету міфапаэтычным мысленнем, сродкам арганізацыі шырокага спектра парадыгмальнага разумення рэчаіснасці на аснове асобых пазнаваўчых аперацый.

Акрамя «карціны свету» і «мадэлі свету», фундаментальнымі паняццямі катэгарыяльнага апарату сістэмнага даследавання генезісу і функцыянавання колеравага кода беларускай традыцыйнай духоўнай культуры з'яўляюцца паняцці «код» і «сімвал».

*Код* – сістэма абазначэнняў для перадачы, апрацоўкі і захавання інфармацыі ў форме канцэптуальных утварэнняў, корпус аднатыпных знакаў, які мае сваю парадыгматыку і сінтагматыку. Кожны код вызначаецца ўласнай сістэмай рэлевантных прыкмет, якія выяўляюцца ў наборы і суадносінах адзінак гэтага кода. *Колеравы код* трактуецца намі як сродак традыцыйнага мадэліравання свету на аснове яго пазнання, ацэнкі і апісання праз колеравыя сімвалы, якія ўтвараюць сістэму парадыгматычных і сінтагматычных адносін. Колеравы код можа разглядацца як падкод атрыбутыўнага кода – кода якасцяў і прыкмет, у які ўваходзяць маркіраваныя міфапаэтычным мысленнем уласцівасці і здатнасці чалавека і жывёл (рысы фізічнага аблічча – колер валасоў, вачэй, лысы, голы і г.д.; звышнатуральныя ўласцівасці – дурное вока, абарачальнасць, яснабачанне і г.д.); лічбы і парадак (1, 2, 3, 4, 7, 9, 12, 40, 77 і г.д.; першы, другі, апошні, цотны, няцотны і г.д.); іншыя прыкметы, што ўтвараюць бінарныя апазіцыі тыпу «свой/чужы», «левы/правы», «верх/ніз», «мужчынскі/жаночы», «стары/малады», «сыры/вараны».

Фарміраванне і развіццё колеравага кода беларускага фальклору адбывалася на аснове славянскай архаічнай карціны свету. Разам з тым яго сімвалы неабходна разглядаць як сродкі знакавай фіксацыі фрагментаў карціны свету ў мадэлі свету. Вырашэнне замкнёнага ў «герменеўтычнае кола» тэзіса «цэлае дадзена ў частках, часткі пазнаюцца праз прызму цэлага» адкрываецца пры ўмове анталагічнай спалучальнасці, узаемнай скіраванасці карціны свету, мадэлі свету, кодаў, сімвалаў.

*Сімвал* – сінтэтычны вобраз, які ў працэсе інтэлектуальна-мастацкага асваення рэчаіснасці, «апрадмечвання каштоўнасці» акумулюе глыбінныя сэнсы традыцыйнай духоўнай культуры, мадэлюючы вызначаныя феномены ў пачуццёва-канкрэтнай форме, выклікае ўстойлівыя асацыяцыі на падставе традыцыйных сэнсавых атаясамліванняў. *Вобраз* (міфапаэтычны) пры гэтым разумеецца як вынік і ідэальная форма пачуццёва-канкрэтнага, цэласнага, эмацыянальнага адлюстравання прадметаў і з’яў, мадыфікаванага ў адпаведнасці з законамі прадуцыравання пэўных міфа-фальклорных тэкстаў. Функцыянаванне вобраза як сімвала звязана з набыццём змястоўнай глыбіні, сэнсавай перспектывы, каштоўнасці, замацаваных традыцыяй.

**Заключэнне**

У заключэнне адзначым, што пры вырашэнні задач, звязаных з сістэмным аналізам колеравых сімвалаў беларускага фальклору, гісторыка-генетычнае даследаванне колеравага кода павінна дапаўняцца функцыянальна-семантычным. Прадуктыўным з’яўляецца выкарыстанне функцыянальна-семантычнага, структурна-тыпалагічнага і параўнальна-гістарычнага метадаў. Прымяненне функцыянальна-семантычнага метаду дасць магчымасць высветліць, што іменна ў генезісе колеравага кода абумоўлена пазафальклорнымі сувязямі і як гэтыя сувязі прадстаўлены ў ім, а таксама ўстанавіць месца колеравага кода ў беларускім фальклоры. Структурна-тыпалагічны метад дазволіць раскрыць механізмы ўпарадкавання семантычных сувязей колеравага сімвала, інтэрпрэтаваць колеравыя сімвалы беларускай духоўнай традыцыйнай культуры, прадставіўшы іх у межах цэласнага ўтварэння, якое функцыянуе разам з іншымі кодамі. Пры дапамозе параўнальна-гістарычнага метаду магчыма высветліць генезіс колеравага кода, вызначыць паралелі вывучаемай з’явы ў міжнацыянальных маштабах.

Перспектыва даследавання сімвалічнай «мовы колераў» звязана з усведамленнем цэласнасці традыцыйнай культуры. Мэтай даследаванняў, звязаных з колеравым кодам фальклору пэўных славянскіх традыцый, можа стаць аб’ёмная інтэгральная рэканструкцыя кодаў славянскай культуры як асобнай макрасістэмы, сістэмнае вывучэнне карціны свету, мадэлі свету старажытных славян, рэканструкцыя традыцыйнага мыслення ў цэлым, супастаўленне славянскай фальклорнай традыцыі з традыцыямі іншых народаў, перадусім тых, з якімі славяне ўступалі ў цесны кантакт. Такая праца павінна быць комплекснай як паводле спалучэння розных метадаў і прыёмаў апісання, так і паводле ўключэння фальклорыстычнай праблематыкі ў больш шырокае кола культуралагічных праблем.

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Лотман, Ю.М. Внутри мыслящих миров. Человек – текст – семиосфера – история / Ю.М. Лотман. – М. : Языки русской культуры, 1996. – 464 с.
2. Фрейденберг, О.М. Миф и литература древности / О.М. Фрейденберг. – М. : Наука, 1978. – 605 с.
3. Буслаев, Ф.И. Народный эпос и мифология / Ф.И. Буслаев. – М. : Высш. шк., 2003. – 400 с.

4. Леви-Строс, К. Путь масок / К. Леви-Строс ; пер. с фр., сост. А.Б. Островского. – М. : Республика, 2000. – 399 с.

5. Байбурин, А.К. Код(ы) и обряд(ы) / А.К. Байбурин, Г.А. Левинтон // Кодови словенских култура. Број 3 : Свадба. – Београд : CLIO, 1998. – С. 239–257.

6. Чарота, І.А. Пошук спрадвечнай існасці : Беларуская літаратура ХХ стагоддзя ў працэсах нацыянальнага самавызначэння / І.А. Чарота. – Мінск : Навука і тэхніка, 1995. – 159 с.

7. Тэрнер, В. Символ и ритуал / В. Тэрнер ; пер. с англ., вступит. ст. В.А. Беймана. – М. : Наука, 1983. – 277 с.

8. Серов, Н.В. Семантика цвета в универсалиях культуры / Н.В. Серов // Великие преобразователи естествознания. Блез Паскаль : тезисы докл. XIX Междунар. чтений, Минск, 26–27 ноября 2003 г. / БГУИР. – Минск, 2003. – С. 20–22.

9. Аникин, В.П. Теория фольклора : курс лекций / В.П. Аникин. – М. : КДУ, 2004. – 432 с.

***Shved I.A.*** **Theoretical and Methodological Basis of the Research of Colour Symbols of Mytho-Poetical Thinking of the Belarusians**

The article deals with theoretical and methodological basis of the research of colour symbols of mytho-poetical thinking of the Byelorussians. Colour symbols can be thorough investigated only in the limits of untrue code. Historic-genetic research of the colour code of the Belarusian folklore is supplemented by function-semantic research. The paper studies various syntagmatic combinability of colour symbols, reveals their deep paradigmatic connections. It is based on the material of various folklore genres and of forms of Belarusian folk culture and Slavonic cultural substratum in general. It’s also based on the achievements in such spheres.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 12.02.2011